# Аркадзь Куляшоў

1914-1978

MyShared

# Дзяцінства

**Пачалася жыццёвая сцежка А. Куляшова 6 лютага 1914 года ў вёсцы Саматэвічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.**

**У восем гадоў хлопчык захапіўся творчасцю М. Ю. Лермантава. Ён прачытаў паэму «Мцыры», якая зрабіла на яго такое вялікае ўражанне, што А. Куляшоў вырашыў узяцца за пяро.**

**Калі Аркадзю споўнілася дванаццаць гадоў, у клімавіцкай раённай газеце «Наш пра цаўнік» быў надрукаваны яго першы верш.**



**Маці і бацька паэта - Кацярына Фамінічна Ратабыльская і Аляксандр Мікалаевіч Куляшоў.**

MyShared



А. Куляшоў - выпускнік Саматэвіцкай сямігодкі. 1928 г.

# Юнацтва

У 1921 А. Куляшоў пачаў вучыцца ў Саматэвіцкай школе-сямігодцы.

Пасля заканчэння ў 1928 годзе Саматэвіцкай сямігодкі Куляшоў вучыцца ў Мсціслаўскім педагагічным тэхнікуме. Тут дзейнічала студыя літаратурнага аб'яднання «Маладняк», пачыналі сваё паэтычнае жыццё таленавітыя мастакі слова Ю. Таўбін і З. Астапенка. Куляшоў пасябраваў з імі .

MyShared

# Маладосць

У хуткім часе малады паэт выходзіць на ўзровень рэспубліканскага друку: яго творы з'яўляюцца ў газеце «Чырвоная змена», часопісах «Полымя» і «Маладняк».

У 1931 годзе А. Куляшоў паступае на літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута.

Аўтар шукаў сябе, асэнсоўваў розныя тэмы, спрабаваў у розных жанрах.

У 1930-я гады паэт бярэцца за асваенне вялікай паэтычнай формы — паэмы, у распрацоўцы якой ён дасягае вялікіх поспехаў.
У 1934 годзе прыняты ў Саюз беларускіх пісьменнікаў.



А. Куляшоў, Аляксей Зарыцкі, Аксана Вечар.

MyShared

# У час вайны



А. Куляшоў на Бранскім фронце. 1943 г.

Пасля развязвання фашызмам Другой сусветнай вайны А. Куляшоў у 1940 годзе піша паэму «Хлопцы апошняй вайны», у якой спрабуе паглядзець на вайну як на ўсеагульную трагедыю.

У чэрвені 1941 года А. Куляшоў пакінуў разбураны фашысцкай бамбардзіроўкай, ахоплены пажарам Мінск.

MyShared

**Пад Ноўгарадам закончыў ваенна-палітычнае вучылішча і быў накіраваны ў газету «Знамя Советов».**

**Асноўным жанрам паэзіі А. Куляшова перыяду вайны становіцца балада.**



*А. Куляшоў у вайсковай газеце.*

# Пасля вайны

Са снежня 1943 года і да самага вызвалення рэспублікі Аркадзь Аляксандравіч працуе ў Беларускім штабе партызанскага руху. Пасля заканчэння вайны ён узначальвае калектыў штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва».

У 1946 годзе ён становіцца лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР за паэму «Сцяг брыгады», а ў 1949 годзе паўторна атрымлівае названую прэмію за паэму «Новае рэчышча».



*А. Куляшоў - лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Мінск, 1946 г.*

MyShared

# 1950-1960 гг.



**А. Куляшоў падпісвае кнігу Твардоўскаму. Масква, 1949 г**

**У пасляваенны час А. Куляшоў напісаў шмат твораў пра выдатных сыноў нашага народа.**

**А. Куляшоў - удзельнік Рэспубліканскага шахматнага турніра. Мінск, 1952 г.**



# «Беларусьфільм»



*А. Куляшоў з сынам Сашам у Калінкавічах. 1950 г*

**З 1958 па 1967 год А. Куляшоў працаваў начальнікам сцэнарнага аддзела, а потым галоўным рэдактарам на кінастудыі «Беларусьфільм».**

**Піша сцэнарыі да некалькіх мастацкіх і дакументальных фільмаў: разам з А. Кучарам да фільма «Чырвонае лісце», у суаўтарстве з Максімам Лужаніным да кінафільма «Першыя выпрабаванні» па трылогіі Якуба Коласа «На ростанях» і да фільма «Запомні гэты дзень».**

MyShared

# Фотаздымкі



А. Куляшоў. 1972 г.



А. Куляшоў з Максімам Танкам. 1975 г.

MyShared



*З сямьей. Злева направа - сын Уладзімір, жонка Аксана Фёдараўна, унук Уладзімір, Ірына Рогава, дачка Валянціна, сын Аляксандр і Аркадзь Куляшоў. Мінск, 1960 г.*

З 1967 года А. Куляшоў займаецца толькі літаратурнай дзейнасцю.

У 1968 годзе паэт напісаў паэму «Цунамі». За некалькі гадоў да гэтага ён выдаў «Новую кнігу», у якой стрыжнёвай тэмай была філасофская.

MyShared

# У ролі дэпутата

**У 1947—1978г Аркадзь Куляшоў дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 2—8-га скліканьняў.**
**У 1961 г. у складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце XVI сэсіі Генеральнай Асамблеі ААН.**



*Давід Кугульцінаў, Аркадзь Куляшоў, Пімен Панчанка. 1973 г*

MyShared

# Памяць



*Літаратурны музей імя Аркадзя Куляшова.*
*Новасаматэвіцкая сярэдняя школа.*

**Памёр у ноч на 4 лютага 1978 у санаторыі ў Нясьвіжы, пахаваны ў Менску на Ўсходніх могілках.**

**А. Куляшоў вядомы ў беларускай літаратуры як выдатны перакладчык. Дзякуючы яму на роднай мове загучалі знакаміты твор А. С. Пушкіна «Яўгеній Анегін», паэзія М. Ю. Лермантава, Т. Шаўчэнкі, С. Ясеніна і інш.**

**За вялікую перакладчыцкую працу А. Куляшоў быў адзначаны ў 1970 годзе Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Янкі Купалы.**

MyShared

# Дзякуй за ўвагу

MyShared